Усё вышэй сказанае дазваляе зрабіць вынік, што такая форма музычнага выканальніцтва, як ансамбль народных інструментаў, знаходзіцца ў пастаянным развіцці, удасканальванні.


1. *Имханицкий, М. И.* История исполнительства на русских народных инструментах: учеб. пособие для муз. вузов и училищ / М. И. Имханицкий. – М. : Изд-во РАМ им. Гнесиных, 2002. – 351 с.

2. Методыка і практыка самадзейнага аркестра народных інструментаў : вучэб-метад. дапаможнік / Мін. ін-т культуры ; склад. С. А. Анікееў. – Мінск : МІК, 1992. – 91 с.

3. Народно-инструментальное исполнительство Беларуси: вопросы теории, истории и методики : учеб. пособие / Белорус. гос. ин-т проблем культуры ; ред.-сост. Л. В. Шибаева. – Минск : БелГИПК, 2004. – 152 с.



**В. М. Валатковіч,**
*загадчык кафедры духавой музыкі,*
*дацэнт*


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# АСНОЎНЫЯ ПРАБЛЕМЫ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ ПА ДЫРЫЖЫРАВАННІ Ў ПРАЦЭСЕ ПАДРЫХТОЎКІ КІРАЎНІКОЎ АМАТАРСКІХ КАЛЕКТЫВАЎ ВЫШЭЙШАЙ КВАЛІФІКАЦЫІ (НАРОДНЫЯ, ДУХАВЫЯ І ЭСТРАДНЫЯ АРКЕСТРЫ)

Дырыжорскае мастацтва як найвышэйшы ўзровень музычнага выканальніцтва на сучасным этапе, як вызначыў І. Стакоўскі, засталося адной з самых туманных і няправільна ўспрымаемых галін музычнага выканальніцкага мастацтва. У методыцы выкладання дырыжыравання таксама ёсць шэраг супярэчнасцей, бо пры наяўнасці шэрага тэарэтычных распрацовак па тэхніцы дырыжыравання навучэнцу няпроста арыентавацца ў інфармацыі з прычыны або значнай складанасці, або недастатковай асэнсаванасці ролі тэхнікі дырыжыравання як сродку дасягнення пэўнай мастацкай задачы.

Аналіз дзейнасці кіраўнікоў народных, духавых і эстрадных аркестраў Рэспублікі Беларусь дазваляе зрабіць выснову аб тым, што агульны ўзровень тэхнікі дырыжыравання невысокі. Нягледзячы на як быццам бы плённую канцэртна-выканальніцкую дзейнасць, такая карціна назіраецца нават сярод кіраўнікоў, якія маюць адпаведную спецыяльную дырыжорскую падрыхтоўку сярэдняй або вышэйшага адукацыі.

Працэс асваення дырыжорскага майстэрства – справа не аднаго дня. Змест асноўных кампанентаў дырыжорскай падрыхтоўкі патрабуе пастаяннага іх асэнсавання і практычнага засваення.

Толькі пры ўмове авалодання тым ці іншым прыёмам, адпрацоўцы да графічнай дакладнасці канкрэтнага элемента дырыжыравання кіраўнік народнага, духавога ці эстраднага аркестра можа быць упэўнены, што канкрэтнасць, выразнасць, пераканаўчасць яго жэстаў дапаможа ўдзельнікам аркестравага калектыву правільна зразумець характар і раскрыць змест музычнага твора. А гэта ўмовы для таго, каб музычнае аркестравае выканальніцкае майстэрства максімальна садзейнічала фарміраванню мастацкага густу слухачоў, развівалася на высокім якасным узроўні, садзейнічала сацыяльнаму прэстыжу творчасці аркестраў краіны.

У выніку мы прыйшлі да высновы, што такая сітуацыя ўзнікае з-за прабелаў у дырыжорскай падрыхтоўцы кіраўнікоў у час іх навучання ў той ці іншай навучальнай установе. Несур'ёзныя адносіны да адпрацоўкі асноўных элементаў тэхнікі дырыжыравання назіраюцца часта і ў студэнтаў аркестравых спецыялізацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Усё гэта памнажае памылкі. Такім чынам, лагічны вывад: тэарэтычныя, тэхналагічныя і практычныя моманты комплекснай падрыхтоўкі па дырыжыраванні непасрэдным чынам адбіваюцца на якасці творчай дзейнасці калектываў, а значыць, будуць уплываць на агульны ўзровень мастацкай культуры краіны.

Адна з галоўных умоў паспяховага навучання – кіруемая самастойная работа па ўдасканаленні ведаў, якія студэнт атрымаў на занятках па дырыжыраванні.

Працэс асваення дырыжыравання складаецца з двух відаў дзеянняў. Першае: асваенне музычнага тэксту ва ўсім аб'ёме выразных сродкаў фарміравання мастацкіх задач. Зыходзячы з канкрэтных выканальніцкіх мэт вынікае другое дзеянне: рэалізацыя творчых намераў пры дапамозе дырыжорскай тэхнікі.

Пры вывучэнні дысцыпліны «Дырыжыраванне» галоўнай умовай з'яўляецца засваенне ведаў аб яе змесце. У дадзеным выпадку неабходна выдзеліць два тыпы ведаў: 1) веды аб сутнасці і тэматычным змесце дысцыпліны; 2) тэхналогія і спосабы канкрэтных выканальніцкіх кампанентаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Да ведання першага тыпу трэба, на наш погляд, аднесці наступнае:

– тэхніку дырыжыравання, яе функцыі;

– кампаненты дырыжорскага апарату, іх магчымасці;

– уласцівасці (змест) аўфтакта (хуткасць, амплітуда, працягласць, сіла);

– структуру аўфтакта (замах, імкненне, кропка, адлюстраванне);

– інфармацыйныя магчымасці аўфтакта;

– передачу характару гучання, метра, тэмпу, рытму, дынамікі, пачатку гучання, зняцця.

Веданні першага тыпу дазваляюць засвоіць веданні другога тыпу. Да гэтых ведаў мы адносім парадак пабудовы і спосаб перадачы асноўных дырыжорскіх прыёмаў:

– метрычных схем (простых, складаных, змешаных);

– асноўных штрыхоў;

– суадносіны актыўных і пасіўных жэстаў;

– паказ уступу і спынення гучання;

– унутрыдолевае запаўненне дырыжорскага жэста (дуолі, трыёлі, пункцірны рытм, працягласць гукаў);

– выраз дынамікі;

– выраз тэмпаў;

– паказ паўз, фермат і іх разнавіднасцей;

– магчымасці левай рукі.

Значэнне першага і другога тыпу ведаў адлюстроўваецца ў наступных навыках і уменнях, якімі павінен авалодаць дырыжор на аснове выкладзеных вышэй ведаў. Да іх адносяцца:

– передача метра;

– передача гуказнаўства;

– перадача дынамікі;

– перадача тэмпу;

– паказ пачатку гучання;

– паказ зняцця гучання;

– унутрыдолевае запаўненне дырыжорскага зместу;

– паказ паўз, фермат і да т. п.

Сфарміраваныя на аснове ведаў уменні павінны набываць пэўную ступень аўтаматызаванасці (але не штампаў), відазмяняцца ў залежнасці ад канкрэтнага музычнага тэксту. Дадзеныя ўменні павінны быць усвядомлены, асэнсаваны ў залежнасці ад канкрэтных выканальніцкіх задач.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пад дырыжорскім апаратам маецца на ўвазе разнастайнасць рухаў рук, зведзеных у сістэму дырыжыравання, пастава корпуса, галавы і ног, міміка, пры дапамозе якіх дырыжор перадае свае мастацкія намеры. Усё аблічча дырыжора павінна дапамагаць рукам, садзейнічаць выразнасці дырыжыравання. У час заняткаў трэба асабліва звярнуць увагу на адзінства ўсіх кампанентаў.

Мануальная тэхніка атрымала назву ад лацінскага слова *monus* – 'рука'. Рукі дырыжора з'яўляюцца асноўным элементам дырыжорскага апарату, пры дапамозе іх ён перадае інфармацыю аб метры, тэмпе, дынаміцы, штрыху. Размераныя рухі рук адлюстроўваюць метр музыкі, хуткасць іх чаргавання – тэмп, змяненні амплітуды жэста перадаюць дынаміку, а звязанасць або раздзельнасць – штрыхі.

Пры фарміраванні дырыжорскага апарату ў студэнтаў узнікае шэраг тыпавых памылак:

– заціснутасць асобных кампанентаў дырыжорскага апарату;

– няправільная пастава корпуса;

– недакладная пластычнасць кампанентаў дырыжорскага апарату;

– няма ўзгодненнасці дзейнасці правай і левай рук;

З мэтай выпраўлення недахопаў студэнтам рэкамендуецца:

– праанілізаваць фізіялагічную (мышачную) свабоду ўсіх кампанентаў дырыжорскага апарату;

– выкарыстаць комплекс практыкаванняў па вызваленні заціснутасці дырыжорскага апарату;

– сістэматычна і свядома выконваць практыкаванні ў памерных тэмпах;

– выкарыстоўваць магчымасці відэазапісу.

У залежнасці ад зместу выконваемага твора, дырыжорскія жэсты бываюць павольнымі або рэзкімі, лёгкімі або напоўненымі сілай, мяккімі або энергічнымі.

У працэсе дырыжыравання рухі рук падпарадкоўваюцца строгай паслядоўнасці і выконваюцца па пэўных плоскасцях, аб'яднаных у формы руху, што скаліся ў практыцы, – тактавыя схемы. Пасля адпаведнай падрыхтоўкі «ўвага» (гэты элемент спецыяльна не выдзяляем са структуры аўфтакта, але ён мае велізарнае значэнне як момант, які мабілізуе дзеянні дырыжора і выканаўцаў) дырыжор падымае рукі, пасля праламлення жэста на некаторым узроўні апускае іх, дакранаючы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ся да ўяўнай плоскасці. У дадзены момент узнікае гучанне, пасля чаго жэст адскоквае і спыняецца. Такі асобны рух называецца аўфтактам – жэстам, які папярэджвае момант выканання кожнай з долей такта і па часавай працягласці роўны працягласці вызначаемай долі.

Змест «замаху» вызначаецца мастацкай задачай і выражаецца ў яго розных уласцівасцях – хуткасці выканання, амплітудзе, энергіі, характары выканання.

Пры пастаноўцы дырыжорскага апарату ў студэнтаў таксама ўзнікае шэраг тыповых памылак, якія часткова могуць быць звязаны з папярэднімі тэмамі:

– недастатковая ўсвядомленасць на ўзроўні ведаў;
– адсутнасць графічнай яснасці ў дырыжорскім жэсце;
– несувымернасць элементаў у структуры аўфтакта;

З мэтай выпраўлення недахопаў студэнтам рэкамендуецца:

– удакладніць веды аб выкананні аўфтакта;
– выкарыстоўваць магчымасці відэазапісу;
– на паперы маляваць мадэль аўфтакта;
– перанасіць мадэлі аўфтакта на ўяўную плоскасць.

Схема тактавання – гэта ўмоўна графічнае абазначэнне чаргавання долей у такце. Кожнай долі адпавядае пэўны напрамак. Правільнасць выканання дырыжорскай схемы аказвае вялікі ўплыў на дакладнасць аркестравага выканання.

Асваенне дырыжорскіх схем мэтазгодна пачаць з чатырохдольнай схемы. Яна з'яўляецца ўніверсальнай, змяненне чатырохдольнай схемы дае магчымасць трансфармаваць яе ў трох і двухдольную або больш складаныя пяцідольную, шасцідольную, сямідольную і г. д.

Пры асваенні схем тактавання студэнту неабходна выпрацаваць строгую паслядоўнасць дзеянняў, якая дазваляе асэнсаваць дзеянне і ацаніць вынікі, зыходзячы з канкрэтнай сістэмы крытэрыяў якасці выконваемых дзеянняў. Для гэтага прапануецца наступная навучальная карта.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## НАВУЧАЛЬНАЯ КАРТА
## «СХЕМЫ ДЫРЫЖЫРАВАННЯ»

| Заданне | Арыенціровачныя правілы выканання дзеяння | Парадак выканання дзеяння |
|---|---|---|
| Прадырыжыраваць чатырохдольную схему | Дадзеная схема ўключае чатыры метрычныя долі | Паставіць рукі ў пазіцыю «ўвага» |
| | Кожная доля суадносіцца па велічыні амплітуды ў наступным парадку: 1) моцная; 2) адносна моцная; 3) слабая; 4) найбольш слабая | Намеціць месцазнаходжанне долей схемы |
| | Неабходна забяспечыць графічную выразнасць дадзеных суадносін | Вызваліцца ад скаванасці, заціснутасці рук |
| | Рухі выконваюцца павольна, свабодна, выключаецца скаванасць дырыжорскага апарату | Вызначыць хуткасць і амплітуду жэста |
| | Дзеянні выконваюцца на розных узроўнях і ў розных дыяпазонах, пры рознай амплітудзе жэста | Выканаць дзеянне |

Дадзеная карта арыенціраў дазволіць студэнту актыўна, усвядомлена выканаць дзеянне, сфарміраваць яго ў прафесійнае ўменне. Заданне відазмяняецца згодна з тэмай.

| балы / крытэрыі | 10–8 | 7– 6 | 5–4 | 3–2 |
|---|---|---|---|---|
| Паўната ведаў аб дзеянні | Веды паказаны ў поўным аб'ёме | Веды паказаны з нязначнымі недакладнасцямі | Веды паказаны са значнымі недакладнасцямі | Веды не паказаны |
| Дакладнасць выканання дзеяння | Дзеянні выкананы ў поўным аб'ёме | Дзеянні выкананы з нязначнымі недакладнасцямі | Дзеянні выкананы са значнымі недакладнасцямі | Дзеянні выкананы хаатычна |
| Аўтаматызаванасць дзеяння | Дзеянне выконваецца лёгка, свабодна; рухі вар'іруюцца, выкананне дакладнае | Дзеянне выконваецца з некаторым напружаннем, нязначнымі недакладнасцямі | Дзеянне выконваецца з цяжкасцю, значныя недакладнасці | Дзеянне не выконваецца |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Працэс засваення ведаў аб канкрэтным дзеянні і фарміраванне яго ва ўменне праходзіць шэраг этапаў: выкладанне ва ўмоўнай форме парадку выканання дзеяння практычна і дасягненне пэўнай ступені аўтаматызаванасці. Згодна з гэтым парадкам прапанавана шкала крытэрыяў ацэнкі.

Пры асваенні схемы тактавання ў студэнтаў узнікаюць памылкі, якія могуць быць звязаны з папярэднімі тэмамі:

– няправільныя суадносіны метрычных долей;

– адсутнасць графічнай яснасці ў дырыжорскім жэсце;

– заціснутасць асобных кампанентаў дырыжорскага апарату.

З мэтай выпраўлення недахопаў студэнтам рэкамендуецца:

– сістэматычна і свядома выконваць практыкаванні ў памерных тэмпах;

– выкарыстоўваць магчымасці відэазапісу;

– выкарыстоўваць комплекс практыкаванняў па вызваленні заціснутасці дырыжорскага апарату.

Аналагічна студэнт самастойна або з дапамогай выкладчыка можа пабудаваць навучальныя карты па асноўных раздзелах дырыжорскай тэхнікі: штрыхі ў дырыжыраванні, дынаміка ў дырыжыраванні і інш. Самастойны кантроль дзеяння дазволіць ацаніць яго па прапануемай сістэме крытэрыяў, якая адлюстравана ў навучальнай карце «Схемы дырыжыравання».

1. *Багриновский, М.* Дирижерская техника рук : практ. рук. к изучению основ мануальной техники дирижирования / М. Багриновский. – М. : Высш. уч-ще военных дирижеров Советской Армии, 1947.

2. *Казачков, С.* Дирижерский аппарат и его постановка / С. Казачков. – М. : Музыка, 1967. – 11 с.

3. *Канн, Э.* Элементы дирижирования / Э. Канн ; пер. с англ. Д. Э. Далгота. – Л. : Музыка, 1980. – 216 с.

4. *Канерштейн, М. М.* Вопросы дирижирования: учеб. пособие для муз. вузов / М. М. Канерштейн. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Музыка, 1972. – 255 с.

5. *Карацееў, А. Л.* Змест і практычная накіраванасць навучальна-творчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў (арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву) : вуч.-метад. дапам. / А. Л. Карацееў. – Мінск : МІК, 1993. – 27 с.

6. *Мазанік, В. У.* Айчынная музыка: станаўленне дырыжорскай адукацыі / В. У. Мазанік // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

7. *Мазанік, В. У.* Асаблівасці падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў на ФЗН у Беларускім універсітэце культуры // Выкарыстан-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

не інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў : матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 2–3 лютага 1998 г.) / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – С. 95–100.

8. *Малько, Н. А.* Основы техники дирижирования / Н. А. Малько. – М. ; Л. : Музыка, 1965. – 134 с.

9. *Маталаев, Л.* Основы дирижерской техники : метод. пособие / Л. Маталаев ; общ. ред. С. Скрипки. – М. : Сов. композитор, 1986. – 208 с. : ил., 1 л. ил.

10. *Мусин, И.* Техника дирижирования : практ. рук. / И. Мусин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Деан–Адиа–М, 1995. – 295 с.

11. *Ольхов, К.* Теоретические основы дирижерской техники / К. Ольхов. – 3-е изд. – Л. : Музыка, 1990. – 200 с.

12. *Свечков, Д.* Основные элементы дирижерской техники : учеб. пособие / Д. Свечков ; М-во культуры РСФСР ; Глав. упр. учеб. заведений и кадров. – М., 1966. – 45 с.

**Н. И. Влазнюк,**
*старший преподаватель кафедры*
*русского языка как иностранного*

## РОЛЬ СОВРЕМЕННЫХ ГАДЖЕТОВ В ОБУЧЕНИИ ПИСЬМЕННОЙ РЕЧИ ИНОСТРАННЫХ АСПИРАНТОВ

Ускоренное развитие высоких технологий, которое мы наблюдаем на современном этапе, их влияние на все сферы жизни невозможно игнорировать при организации образовательного процесса в учреждении высшего образования, в частности, при обучении иностранному языку. Однако новые подходы к преподаванию иностранного языка должны одновременно сочетать в себе традиции и инновации, не нарушая тем общепринятые дидактические принципы. Одним из способов повышения мотивации иностранных учащихся может стать использование современных устройств (гаджетов). Электронные гаджеты могут быть привлечены преподавателями русского языка как иностранного для реорганизации учебного процесса, развития и обеспечения самостоятельной работы учащихся, поиска и внедрения новых форм обучения.

Использование современных гаджетов, интерактивных форм обучения, мультимедийных компонентов для создания инновационной образовательной среды в учебной и внеаудиторной познавательной деятельности учащихся является перспектив-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ